Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Полоцкий государственный университет»

Региональный учебно-научно-практический Юридический центр

# ТРАДИЦИИ И ИННОВАЦИИ В ПРАВЕ

Материалы международной
научно-практической конференции,
посвященной 20-летию юридического факультета
и 50-летию Полоцкого государственного университета

(Новополоцк, 6–7 октября 2017 г.)

В трёх томах
Том 3

PolotskSU

Новополоцк
2017

УДК 34(082)
ББК 67я43

Рекомендован к изданию
советом юридического факультета
Полоцкого государственного университета (протокол № 7 от 04.09.2017 г.)

*Редакционная коллегия:*
И. В. Вегера, кандидат юридических наук, доцент (отв. редактор);
Д. В. Щербик, кандидат юридических наук, доцент;
В. А. Богоненко, кандидат юридических наук, доцент;
Е. Н. Ярмоц, кандидат юридических наук, доцент;
П. В. Соловьёв, магистр юридических наук

*Рецензенты:*
Г. А. Василевич, доктор юридических наук, профессор;
Т. И. Довнар, доктор юридических наук, профессор;
В. М. Хомич, доктор юридических наук, профессор

**Традиции и инновации в праве** : материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 20-летию юрид. фак. и 50-летию Полоц. гос. ун-та, Новополоцк, 6–7 окт. 2017 г. : в 3 т. / Полоц. гос. ун-т, Регион. учеб.-науч.-практ. Юрид. центр ; редкол.: И. В. Вегера (отв. ред.) [и др.]. – Новополоцк : Полоцкий государственный университет, 2017. – Т. 3. – 304 с.

ISBN 978-985-531-571-2.

Предложены материалы, в которых обсуждаются проблемы юридической науки и практики с позиций преемственного и инновационного развития национальных правовых систем и международного права.

Адресован научной юридической общественности, практическим работникам, преподавателям, студентам юридических факультетов, слушателям переподготовки по специальности «Правоведение», а также всем, кто интересуется актуальными проблемами в праве.

**УДК 34(082)**
**ББК67я43**

**ISBN 978-985-531-571-2 (Т. 3)**
**ISBN 978-985-531-568-2**

© Полоцкий государственный университет, 2017

УДК 343(476)(091)

# САВЕЦКАЕ КРЫМІНАЛЬНАЕ ПРАВА ЯК СРОДАК ТРАНСФАРМАЦЫІ ГРАМАДСТВА БЕЛАРУСКАЙ ССР У 1920-Я ГАДЫ

***С.А. Гур'еў,***
*старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, кандыдат юрыдычных навук*

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. перад савецкім кіраўніцтвам як першачарговая задача стаяла замацаванне адбыўшыхся рэвалюцыйных змяненняў, у тым ліку і праз прававое рэгуляванне. Новы дзяржаўны лад і змена сацяльных адносін прывялі да карэннай перабудовы амаль усіх галін тагачаснага права, напрыклад, найбольшыя змены зведалі інстытуты грамадзянскага права, але канцэптуальныя перамены адбыліся і ў крымінальна-прававой сферы.

У першыя гады свайго існавання савецкая ўлада сітуацыйна рэагавала на праяўленні злачыннасці, не мела акрэсленай крымінальна-прававой дактрыны, нігілістычна ставілася да права ўвогуле, чакаючы яго адмірання пры набліжэнні камунізму ў адпаведнасці з панаваўшым у той час вучэннем марксізму. Тым не менш, з заканчэннем грамадзянскай вайны, адноснай палітычнай стабілізацыяй і пераходам да мірнага жыцця кіраўніцтва краіны ўсвядоміла, наколькі моцным інструментам на шляху стварэння новай грамадзянскай супольнасці можа з'яўляцца крымінальнае права.

У 20-я гг. XX стагоддзя адбылося замацаванне ў савецкім крымінальным праве новых канцэптуальных асноў, якія перадвызначылі развіццё гэтай прававой галіны і заклалі падмурак усіх важнейшых падзеяў, датычных крымінальна-прававой палітыкі ў гэты драматычны і шматстайны перыяд айчыннай гісторыі амаль да 1960-х гг., таму спынімся падрабязней на ключавых крымінальна-прававых актах, якія дзейнічалі на тэрыторыі БССР у разглядаемы прамежак часу, а менавіта на крымінальных кодэксах (КК) 1922 г. і 1928 г., а таксама на іх ролі ў працэсе пабудовы грамадства дыктатуры пралетарыяту.

Першы Крымінальны кодэкс 1922 г., які адразу ж пачаў дзейнічаць на тэрыторыі БССР, не змяшчаў прынцыпова новых прававых канцэпцый, на чым настойвалі тагачасныя савецкія навукоўцы, ён грунтаваўся ў пэўнай меры на дарэвалюцыйных, у тым ліку і замежных крымінальна-прававых напрацоўках. У КК быў абагульнены досвед заканатворчай дзейнасці па крымінальнаму праву першых гадоў савецкай улады і судовая практыка [1, с. 72]. У адзначаны час адбывалася развіццё савецкага крымінальнага заканадаўства, навацыі якога апрабаваліся на практыцы [2, с. 18].

Як адзначаў М.М. Ісаеў, найбольш істотным у КК 1922 г. было ўвядзенне мер сацыяльнай аховы, у аснове якіх ляжала адпаведная заходне-еўрапейская тэорыя [3, с. 94]. Маецца на ўвазе сацыялагічная канцэпцыя крымінальнага права, адпаведна якой узамен віны ў якасці падставы ўжывання пакарання прапаноўвалася сацыяльная небяспека асобы і яе дзеяння.

Сацыялагічная і антрапалагічная школы права, у адрозненне ад класічнай, рабілі акцэнт на аналізе злачынства і злачыннасці ўвогуле як сацыяльнай (і нават біялагічнай) з'явы, і распрацоўвалі адпаведныя тэорыі фактараў злачыннасці [4, с. 24]. Сэнс сацыялагічнай тэорыі заключаецца ў тым, каб абараніць грамадства ад небяспекі супрацьпраўных паводзін асобы шляхам яе нейтралізацыі, а таксама выпраўлення гэтай асобы яшчэ да моманту здзяйснення злачынства, прадухіліўшы яго такім чынам [5, с. 581].

На практыцы змест сацыялагічнай крымінальнай канцэпцыі быў скажоны і адапатаваны кіраўніцтвам Беларускай ССР да сваіх ідэалагічных і палітычных патрэб, дазволіўшы ажыццяўляць празмерныя рэпрэсіі ў адносінах да рэальных або ўяўных ворагаў савецкай улады. Крымінальнае права заняла адно з цэнтральных месцаў у сістэме дзяржаўных сродкаў, накіраваных на правядзенне глыбокай сацыяльнай перабудовы ў Беларускай ССР. З выкарыстаннем крымінальнага заканадаўства ажыццяўлялася значная трансфармацыя сацыяльна-эканамічнай, палітыка-ідэалагічнай і іншых сфераў існавання тагачаснай Савецкай дзяржавы. Крымінальнае права ў Беларускай ССР так альбо іначай закранала ўсе найбольш важныя грамадскія праваадносіны, бо яно давала найбольш эфектыўную магчымасць правядзення класавай палітыкі і ўсталявання палітычнага і ідэалагічнага аднадумства ў дзяржаве.

Важнай характарыстыкай Кодэкса, якая адлюстроўвала яго сутнасць і адрознівала ад большасці класічных крымінальных кодэксаў, была класавасць, якая найперш праявілася ў падзеле ўсіх злачынстваў на дзве катэгорыі: накіраваныя супраць усталяваных рабоча-сялянскай уладай асноў новага правапарадку, якія прызнаюцца найбольш небяспечнымі і па якіх вызначаная Кодэксам ніжэйшая мяжа пакарання не падлягала змяншэнню судом, і ўсе астатнія злачынствы, па якіх была ўсталявана вышэйшая мяжа вызначаемага па суду пакарання (арт. 27). Як адзначаў у гэтай сувязі В.В. Нікулін, савецкі суд вызначаў меру пакарання, зыходзячы з класавай прыналежнасці і палітычнай мэтазгоднасці, загадзя вызначаючы вінаватасць або невінаватасць, што падрывала папярэджваючае значэнне пакарання [6, с. 2512].

Архіўныя матэрыялы пацвярджаюць выкарыстанне класавага падыходу ў айчыннай правапрымяняльнай практыцы разглядаемага перыяду. Так, Вярхоўны суд БССР у 1924 г. у прыгаворы па касацыйнай скарзе грамадзян Б. і І. прама ўказаў змякчыць абвінавачаным пакаранне, паколькі апошнія паходзілі з сялян [7]. Таксама і ў адносінах да грамадзянкі Б. у 1925 г. Выязная сесія Вярхоўнага суда БССР, улічваючы сялянскае паходжанне абвінавачанай, змякчыла пакаранне, замяніўшы 3 гады пазбаўлення волі ўмоўным 3-гадовым тэрмінам [8].

Перабудове савецкага грамадства шляхам падаўлення любых праяваў нелаяльнасці новаму строю служыў таксама інстытут аналогіі закона, уведзены ў КК 1922 г. Аналогія ўяўляла небяспеку судовага і карнага самавольства, выкарыстання крымінальнай рэпрэсіі для звядзення рахункаў з непажаданымі асобамі, падмены крымінальнай юстыцыі «палітычнай» [9, с. 24].

Задачай КК была абвешчана прававая ахова дзяржавы працоўных ад злачынстваў і грамадска небяспечных элементаў шляхам прымянення да

Polotsk SU

парушальнікаў правапарадку пакарання або іншых填 мераў сацыяльнай аховы (арт. 5). Злачынствам прызнавалася «усякае грамадска небяспечнае дзеянне або бяздзеянне, якое пагражае асновам савецкага ладу і правапарадку, усталяванаму рабоча-сялянскай уладай на пераходны да камуністычнага ладу тэрмін» (арт. 6).

У той жа час, распрацоўшчыкі КК 1922 г. не змаглі цалкам адмовіцца і ад класічных прававых уяўленняў адносна падставаў прыцягнення да крымінальнай адказанасці (наяўнасць віны ў злачынным дзеянні), таму ў Кодэксе былі штучна сумешчаны два супрацьлеглыя падыходы да гэтага пытання (класічны і сацыялагічны), што не магло адбывацца працяглы час і стала адной з прычын кароткага тэрміну дзеяння Кодэкса.

Наступны КК БССР быў уведзены ў дзеянне з 15 лістапада 1928 г. [10, с. 337]. Ён амаль цалкам абапіраўся на сацыялагічную навуковую канцэпцыю. Пры гэтым, ідэалагічны бок Кодэкса часам меў перавагу над юрыдычным, закону былі ўласцівыя класавасць і палітызаванасць, што стала адной з падстаў масавага парушэння законнасці і палітычных рэпрэсій у 1930-я гг.

Перыяд прыняцця КК 1928 г. адлюстраваў працяг агульнай накіраванасці савецкіх уладаў на згортванне НЭПу, у чым новаму крымінальнаму закону была адведзеная важная роля. Як адзначае О.Н. Мігушчанка, з гэтага часу дзейнасць юрысдыкцыйных органаў дзяржаўнай улады стала прама звязвацца з задачамі сацыяльна-эканамічнай палітыкі [11, с. 23].

Як і КК 1922 г., КК 1928 г. былі ўласцівыя такія негатыўныя рысы, як наяўнасць аналогіі закона, зваротнай сілы закона, інстытута высылкі, класавасць, выкарыстанне тэорыі аб «небяспечным стане асобы». Ідэолагамі БССР была ўзятая на ўзбраенне тэорыя аб абвастрэнні класавай барацьбы па меры пераходу да камунізму, якая выявілася ў тым, што нават пасля заканчэння грамадзянскай вайны, калі ўжо адпала аб’ектыўная неабходнасць ва ўжыванні моцных сродкаў рэпрэсіі супраць палітычных ворагаў, разгарнулася шырокае прымяненне крымінальна-прававой, а такама і пазасудовай рэпрэсіі ў адносінах да недастаткова лаяльных да савецкай улады асобаў, а часта і супраць невінаватых людзей. Такая крымінальна-прававая палітыка негатыўна адбілася на прававым становішчы грамадзян і прывяла да значных сацыяльна-эканамічных страт і выдаткаў.

Такім чынам, у 1920-я гг. крымінальнае права Беларускай ССР зведала рэвалюцыйныя змены, у яго аснову былі пакладзены новыя крымінальна-прававыя канцэпцыі, якія апынуліся магутным інструментам для правядзення карэннай трансфармацыі беларускага савецкага грамадства ў адпаведнасці з панаваўшай камуністычнай ідэалогіяй. Пры дапамозе крымінальнага закона савецкае кіраўніцтва імкнулася вырашыць (і ў значнай ступені вырашыла) свае найбольш вострыя праблемы: адолець рэальныя і ўяўныя контррэвалюцыйныя пагрозы, ізаляваць альбо знішчыць непажаданыя грамадскія элементы, змяніць класавую структуру грамадства, згарнуць НЭП і інш.

Аднак, нягледзячы на рэпрэсіўнасць, класавасць і ідэалагізаванасць крымінальна-прававой палітыкі таго часу, шматлікія негатыўныя рысы крымінальнга заканадаўства ў адпаведнасці з крымінальнымі кодэксамі 1922 г. і

PolotskSU

1928 г., адыход ад некаторых класічных прававых прынцыпаў, развіццё крымінальнага права ў 1920-я гг. прывяло да замацавання законных межаў крымінальнай рэпрэсіі, што ў пэўнай ступені палепшыла прававое становішча грамадзян у параўнанні з першымі паслярэвалюцыйнымі гадамі, калі пакаранне ўвогуле магло прызначацца ў адпаведнасці з "рэвалюцыйнай правасвядомасцю" суддзі.

Як негатыўны, так і станоўчы досвед уздзеяння савецкага крымінальнага права Беларускай ССР на айчыннае грамадства ў 1920-я гг. павінен улічвацца пры канструяванні сучаснага заканадаўства, каб пазбегнуць памылак у гэтай сферы.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***


1. Шыкуноў, В. С. Першы Крымінальны кодэкс, які дзейнічаў у БССР / В. С. Шыкуноў // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1968. – № 5. – С. 71–79.
2. Кочкина, М. В. Административное и уголовное законодательство в условиях становления и эволюции Советского государства: октябрь 1917–1929 гг. : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.01 / М. А. Кочкина ; Самар. гос. экон. ун-т. – Саратов, 2008. – 34 с.
3. Исаев, М. М. Общая часть уголовного права РСФСР / М. М. Исаев. – Л. : Госиздат, 1925. – 199 с.
4. Баумштейн, А. Б. Историческое развитие классической школы уголовного права / А. Б. Баумштейн // История государства и права. – 2013. – № 7. – С. 22–26.
5. Уголовное право. Общая часть : учебник / Н. И. Ветров [и др.] ; под ред.: Н. И. Ветров, Ю. И. Ляпунов. – М. : Новый юрист : КноРус, 1997. – 584 с.
6. Никулин, В. В. Советская концепция правосудия и практика отправления правосудия в 1920-е годы / В. В. Никулин // Право и политика. – 2008. – № 10. – С. 2506–2512.
7. Кассационная жалоба Бабенкова А. Ф., Ивантанова П. И. (1924 г.) // НАРБ. – Ф. 188. Верховный суд БССР. Оп. 1. Ед. хр. 74. Л. 1–7.
8. Дело по обвинению Батуро М. в краже (1925 г.) // НАРБ. – Ф. 189. Высший суд БССР. Оп. 3. Ед. хр. 96. Л. 1–60.
9. Сулейманов, А. А. Уголовный кодекс РСФСР 1922 г.: концептуальные основы и общая характеристика : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.08 / А. А. Сулейманов ; Ульян. гос. ун-т. – М., 2007. – 26 с.
10. История советского уголовного права / А. А. Герцензон [и др.]. – М. : Юрид. изд-во М-ва юстиции СССР, 1948. – 466 с.
11. Мигущенко, О. Н. Карательная (уголовная) политика Советского государства в 20–30-е годы XX в. / О. Н. Мигущенко // История государства и права. – 2010. – № 19. – С. 23–25.


Polotsk SU